Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

21 ВЕРАСНЯ 2023 г. ЧАЦВЕР № 183 (30063)

БЫЦЬ ПРЫГОЖАЙ – БЫЦЬ САПРАЎДНАЙ

ЧЫРВОНКА

ДЭБЮТ ЯК МАГЧЫМАСЦЬ ДЛЯ ІНШЫХ

ЧЫРВОНКА

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір ГУСАКОЎ, старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук:

«У Акадэміі навук моладзі дадзены ўсе магчымасці: праводзяцца навуковыя канферэнцыі, Фестываль навукі, конкурсы, у тым ліку «Сто маладых талентаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», таксама назначаюцца прэміі. Мы стараемся падтрымаць маладых вучоных, дапамагчы ім, садзейнічаць іх развіццю, паколькі за імі будучыня. А іх задача — актыўна, напружана і мэтанакіравана працаваць, абараняць кандыдацкія, доктарскія дысертацыі».

СПЕЛЫ ЯБЛЫЧНЫ ВЕРАСЕНЬ

Фота БелТА.

У фермерскай гаспадарцы «Спартан-Агра», што ў Маладзечанскім раёне, у разгары збор і закладка на захоўванне розных сартоў яблыкаў. Кіраўнік гаспадаркі Ігар АБРАМЧЫК сёлетнім ураджаем задаволены.

КАРАТКА

- **Больш за 7,5 млн тон збожжа з улікам рапсу намалочана ў Беларусі.**
- Міжнародная выстава «Дрэваапрацоўка» пройдзе ў Мінску 26—29 верасня.
- **На тэрыторыі Гродзенскай, Мінскай, Брэсцкай і Віцебскай абласцей праводзіцца імунізацыя дзікіх жывёл для прафілактыкі шаленства.**
- Хрэсны ход з копіяй адной з самых шанаваных праваслаўных святыняў прыбудзе ў Беларусь 4 кастрычніка.
- **Экспарт беларускіх медпаслуг для грамадзян Польшчы за вясну-лета вырас больш як на 25 працэнтаў.**
- У Віцебскай абласной бальніцы адкрылі траўматолага-артапедычнае аддзяленне.
- **Да 75 працэнтаў гародніны, бульбы, садавіны і ягад у Беларусі вырошчваецца на прысядзібных участках насельніцтва.**

Жыллё

Кватэры разыходзяцца як гарачыя піражкі

Як адзначаюць фінансавыя эксперты, рынак жылой нерухомасці выйшаў на беспрэцэдэнтна высокія паказчыкі па колькасці здзелак. Пакупнікі пакуль не збіраюцца спыняцца. А гэта азначае, што 2023 год можа стаць сапраўды рэкордным.

Рэкордныя паказчыкі

Летась колькасць здзелак з кватэрамі дасягнула рэкордных значэнняў. Усяго па краіне купілі звыш 55,6 тысячы жылых аб'ектаў, а ў сталіцы — каля 18 тысяч кватэр. За восем месяцаў бягучага года праведзена ўжо больш за 36 тысяч здзелак па краіне і 12,3 тыс. — у Мінску. Многа гэта ці мала? Давайце прааналізуем.

СТАР. 13

На слыху

СЕЗОН ГРЫПУ ЧАКАЕЦЦА Ў СТУДЗЕНІ — САКАВІКУ

Эпідэміёлаг расказаў, як і калі лепш прышчапіцца

З пачаткам навучальнага года рэгіструецца і рост захворванасці на рэспіраторныя інфекцыі. А іх істотны ўздым у сёлетнім эпідсезоне чакаецца зімой — са студзеня да сакавіка з пікам у лютым. Каб засцерагчы сябе ад адной з самых небяспечных рэспіраторных інфекцый — грыпу, медыкі раяць зрабіць прышчэпку. Якімі вакцынамі сёлета будуць прышчапляць, ці актуальная дагэтуль прышчэпка ад COVID-19 і каму найперш трэба абараніць сябе, расказаў загадчык аддзялення імунапрафілактыкі Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Кірыл ІГНАТАЎ.

Захворванасць прышчэпленых у 6,7 раза меншая

Спецыяліст адзначыў: штогод у нашай краіне больш за чатыры мільёны чалавек хварэе на ВРІ, у тым ліку на грып і COVID-19. У цэлым на долю рэспіраторных інфекцый прыходзіцца больш як 98 % ад усёй інфекцыйнай захворванасці. Дзеці складаюць больш за палову тых, хто хварэе на рэспіраторныя інфекцыі. Пры гэтым апошнія дзевяць сезонаў ахоп насельніцтва прышчэпкамі супраць грыпу складае больш за 40 %. І аналіз у мінулым эпідсезоне паказаў, што больш за 90 % тых, хто захварэў і мае лабараторна пацверджаны дыягназ «грып», не быў вакцынаваны. Захворванасць прышчэпленых у 6,7 раза меншая, чым непрышчэпленых.

СТАР. 3

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СА «ЗВЯЗДОЙ» ЦЯПЛЕЙ І ЎТУЛЬНЕЙ!

Ідзе падпіска на IV квартал 2023 года.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ ВОСЕННЮ І ЗІМОЙ. БУДЗЕ ЦІКАВА!

Блізкая ўлада

УВАГА ДА МАЁМАСНЫХ АДНОСІН, БІЗНЕСУ, ЗДАРОЎЯ

Наталля КАЧАНАВА правяла чарговы прыём грамадзян

Людзі прыходзяць на прыём да Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай пераважна пасля таго, як яны ўжо прайшлі пэўныя інстанцыі і не атрымалі адказу на пытанні, з якімі звярталіся, бо вераць, як неаднаразова даводзілася ад іх чуць, у яе чалавечнасць і справядлівасць. На прыёмы па асабістых пытаннях, якія праводзіць Наталля Качанава, як правіла, запрашаюцца службовыя асобы, кампетэнтныя ў рашэнні абазначаных праблем, а колькасць ахвотных трапіць на аўдыенцыю значна перавышае вызначаны на гэта ў рабочым графіку час. Тым не менш старшыня заўжды працуе, пакуль не выслухае ўсіх, і гэты прыём не стаў выключэннем.

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Цікава, што некаторыя пытанні людзей вырашаюцца, варта ім толькі запісацца на прыём да Наталлі Качанавай. Двое заяўнікаў не прыйшлі менавіта з гэтай прычыны: пытанне аднаго ўрэгулявалі яшчэ да сустрэчы са старшынёй, а другому паабяцалі вырашыць намаганнямі ведамства, дзе працуе чалавек, які шукаў дапамогі на высокім узроўні.

— Часта мы нават не накіроўваем людзей далей, а вырашаем праблемы, якія ў іх узнікаюць, тут, на месцы, каб гэта было аператыўна і хутка. Аднак для сябе робім вывад, што нам трэба больш уважліва глядзець на заканадаўства, якое дзейнічае, і тыя нормы, якія, магчыма, ужо трэба недзе карэкціраваць. У прыватнасці, гэта датычыцца маёмасных адносін, пытанняў прыватнага бізнесу. Абсалютна правамерна, што сёння пільная ўвага існуе і да пытанняў аховы здароўя, якія датычацца не толькі лячэння, але і рэабілітацыі. Гэта пытанні, пра якія Міністэрства аховы здароўя ведае і ўжо займаецца сістэмай рэабілітацыі, што павінна быць створана як на рэспубліканскім узроўні, так і ў нашых гарадах і раёнах, каб людзі маглі атрымаць кваліфікаваную медыцынскую дапамогу і аднавіцца пасля хваробы, якую яны перанеслі, — абазначыла Наталля Качанава.

Вырашылася і праблема пажылой жанчыны, якая ў 2016 годзе купіла ў Мінску кватэру за суму, эквівалентную 40 тысячам долараў, 30 з якіх яна прыдбала ад продажу сваёй старой кватэры, а 10 тысяч — збірала сама. Кватэру жанчына падарыла свайму непаўналетняму ўнуку. Са снежня 2022-га яе пачала праследаваць падатковы інспектар, і вось ужо дзевяць месяцаў органы правяраюць даходы бабулі, паскардзілася яе дачка, якая прыйшла на прыём разам з маці. Апошняя вельмі хацела асабіста трапіць на прыём да Старшыні Савета Рэспублікі.

— Прычапілася да маёй пенсіі, і я не разумею, чаму. Яна (жанчына з падатковай) не верыць у памер маёй пенсіі, прыслала мне даведку, дзе пенсія ў беларускіх рублях, але ж я атрымліваю расійскую пенсію, бо працавала там. Мы з дачкой паехалі ў Пскоў, атрымалі там даведку, а ў яе ўсё роўна пытанні, — паскардзілася жанчына.

— Мы ўжо сабралі ўсе даведкі, каб паказаць, што яна сама зарабіла ўсе гэтыя грошы і адкуль яна іх узяла, і што на пенсіі працягвала працаваць. Няўжо яна не магла сабраць за жыццё дзесяць тысяч долараў?! Аднак яе вымушаюць заплаціць падаткаў пяць тысяч за кватэру. Цяпер мы яе афіцыйна здаём, — падтрымала маці яе дачка.

У адказ на гісторыю **Ігар СКРЫННІКАЎ, намеснік міністра па падатках і зборах,** папрасіў у жанчыны прабачэння і заўважыў, што падатковая не павінна была распачынаць кантрольныя мерапрыемствы ў дачыненні да яе:

— Такія катэгорыі грамадзян увогуле не павінны трапляць у поле зроку кантролю. Па літары закона ў нас пытанні, вядома, былі. Але іншы момант, што не зусім карэктна нашы патрабаванні былі даведзены да заяўніка, і за гэта выбачаемся.

Наталля Качанава рэзюмавала, што на тым праверкі адносна жанчыны скончыліся, і з падатковай яе больш з такім пытаннем турбаваць не будуць.

— Я са снежня, як усё пачалося, спаць нармальна не магу, а сёння хоць засну спакойна, — з удзячнасцю сказала бабуля.

З чым яшчэ прыходзілі людзі да спікера верхняй палаты парламента, «Звязда» падрабязна раскажа ў наступным выпуску «Мясцовага самакіравання».

Ірына СІДАРОК.

Парламенцкі дзённік

НОВЫ ЎЗРОВЕНЬ УЗАЕМАДЗЕЯННЯ

Намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Валерый МІЦКЕВІЧ сустрэўся з дэлегацыяй Ніжагародскай вобласці

У рамках мерапрыемства адбылася цырымонія падпісання пагадненняў аб супрацоўніцтве Брэсцкага, Віцебскага і Гродзенскага абласных Саветаў дэпутатаў з Заканадаўчым сходам Ніжагародскай вобласці.

Валерый Міцкевіч упэўнены, што падпісаныя пагадненні нададуць далейшы імпульс развіццю двухбаковых сувязяў у шматлікіх сферах. «Гэта забеспячэнне роўных правоў грамадзян, падтрымка айчынных таваравытворцаў, комплекснае развіццё сельскіх тэрыторый і многае іншае, — канкрэтызаваў ён. — Менавіта на рэгіянальным узроўні мы можам бачыць найлепшыя прыклады народнай дыпламатыі ў дзеянні».

«Найярчэйшы прыклад супрацоўніцтва — удзел ніжагародскіх прадпрыемстваў і арганізацый у праектаванні і ўзвядзенні Беларускай АЭС, вялікая колькасць матэрыялаў для якой пастаўлялася з вашай вобласці, — звярнуў увагу Валерый Міцкевіч. — У кароткія тэрміны рэалізаваны яшчэ адзін знакавы беларуска-расійскі праект па вытворчасці трамваяў у Ніжагародскай вобласці. Усяго яго магутнасць дазваляе ствараць каля 170 трамваяў у год. Беларускія прадпрыемствы зацікаўленыя і далей пашыраць вытворчую кааперацыю, актыўна ўдзельнічаць у абнаўленні аўтамабільнага парка, а таксама ліфтавога абсталявання Ніжагародчыны. Таксама мы прапануем свае тэхналогіі ў будаўніцтве і рэканструкцыі малочнатаварных комплексаў як пад ключ, так і ў якасці пастаўшчыкоў абсталявання. Пра гэта ішла гаворка на сустрэчы прэм'ер-міністра Беларусі Рамана Галоўчанкі з вашым губернатарам. Лічу, што дэпутаты ўсіх узроўняў тут могуць падключыцца да вырашэння дадзенай задачы».

На дасягнутым ніхто спыняцца не збіраецца. У сумесных планах — наладжванне перспектыўных кантактаў у сферы прамысловай кааперацыі, інвестыцый, максімальная ўвага пытанням імпартазамяшчэння, перааснашчэння прадпрыемстваў, забеспячэнне тэхналагічнага суверэнітэту дзвюх краін. «Такія рэгіянальныя сувязі выводзяць нас на новы ўзровень беларуска-расійскіх адносін, саюзнага будаўніцтва, — рэзюмаваў намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў. — Наша супрацоўніцтва будзе вельмі добрым адказам на санкцыі, палітычны ціск, шантаж з боку калектыўнага Захаду. Разам мы абавязкова выстаім, забяспечым выкананне планаў сацыяльна-эканамічнага развіцця і дастойны ўзровень жыцця нашых грамадзян».

У сваю чаргу, **старшыня Заканадаўчага сходу Ніжагародскай вобласці Яўген ЛЮЛІН** заўважыў, што мэтай візіту з'яўляецца паглыбленне супрацоўніцтва, якое ўжо даўно склалася. «У нас пастаянна павялічваецца аб'ём тавараабароту, сумесная вытворчасці, адкрываем сумесныя прадпрыемствы, толькі ў прамысловай вытворчасці мы падвоілі аб'ёмы за апошнія пяць гадоў, — паведаміў ён. — Палова сельгастэхнікі на палях Ніжагародскай вобласці — беларуская. Ліфты і трамваі ў нас беларускія. Шмат кірункаў, якія за апошнія 25 гадоў актыўна развіваюцца. Мы ўжо навучыліся працаваць разам з нашымі сябрамі-беларусамі па ўсіх кірунках».

Па словах **старшыні Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзіміра ЦЯРЭНЦЬЕВА,** у першую чаргу ставяцца пытанні эканамічнага развіцця рэгіёнаў. «Ніжні Ноўгарад — гэта буйны прамысловы цэнтр, таму мы зацікаўленыя ў супрацоўніцтве з гэтым рэгіёнам, — адзначыў ён. — Складаюць для нас цікавасць і шматлікія кантакты: як на ўзроўні дэпутатаў, так і на ўзроўні моладзі».

Як заўважыла **старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Алена ПАСЮТА,** падпісанне пагадненняў аб супрацоўніцтве з Ніжагародскай вобласцю — прадукт сумеснай двухгадовай работы. «Прынята рашэнне аб правядзенні з'езда малых гарадоў, — удакладніла яна. — Летась такі з'езд быў на тэрыторыі Ніжагародскай вобласці, сёлета ён адбудзецца на тэрыторыі Гродзеншчыны, непасрэдна ў гарадскім пасёлку Зэльва. Гэта для нас пэўны крок, этап ва ўзаемадзеянні. Далейшая работа будзе накіравана на больш цеснае супрацоўніцтва з заканадаўцамі, развіццё сацыяльна-культурных пытанняў, якія востра стаяць і ў адным, і ў другім рэгіёнах».

Вераніка КАНЮТА.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703. УНП 191224638
Продавец	ЗАО «Белтехнология и М», г. Минск, пр. Пушкина, д. 70. УНП 100770618. Тел.: +375 29 6139869

Предмет аукциона

Лот №	Наименование	Нач. цена (с НДС), дол. США	Шаг аукциона', дол. США
	Месторасположение: г. Минск, ул. Притыцкого, 62/ 12		
1	**Ограждение бетонное** (инв. номер 980773)	**900,00**	45,00
	Месторасположение: г. Минск, пр-т Пушкина, 70		
2	**Домик-сторожка** (инв. № 2), **ограждение из металлич. сетки** (инв. № 4), **ворота самонесущие с электромех. приводом и калиткой** (инв. № 5), **теплотрасса** (инв. № 30121)	**550,00**	27,50
3	**Аппарат гидроабразив. резки** (инв. № 70103)	**12 500,00**	625,00
4	**Полуав-т для пайки дорож. резцов модели АПЗ-124** (инв. № 70124)	**250,00**	12,50
5	**Полуавтомат для пайки дорож. резцов модели АПЗ-4** (инв. № 41028)	**250,00**	12,50
6	**Робот промыш. KUKA KR 150 со шкафом управления и соединит. кабелями**	**9 500,00**	475,00
7	**Профильный проектор Helios 350H**	**4 000,00**	200,00
8	**Незавершенное пр-во стана поперечно-клиновой прокатки SP-5000-2**	**100 000,00**	5 000,00
9	**Снегоотбрасыватель ST268EP**	**1 220,79**	61,04
10	**Горячекат. легиров. круглый прокат марки 25МоСr4: d 101.6мм х 8809мм – 2436 кг**	**2 600,00**	130,00
11	**Горячекат. легиров. круглый прокат марки 25МоСr4: d 110,0мм х 8790мм – 2 318,49 кг**	**2 600,00**	130,00
12	**Стальные катанные прутки марки 25 МоСr4, 102,00мм – 1 900,00 кг**	**1 300,00**	65,00
13	**Пресс гидравлический «Гефест» 160.02. с гидравлической станцией в комплекте с маслоохладителем НУ 2503, б/у**	**92 392,98**	4 619,65
14	**Гидравлический агрегат UHAB-SO1772.0.0, б/у, Гидроцилиндр USJ3KS-35-100/70-1000-4823, б/у, Гидроцилиндр USJ6KS-35-125/70-1350-4824, б/у**	**128 733,50**	6 436,68
15	**Гидробак, 2 т., б/у**	**1 693,88**	84,70
16	**Компрессор Spitzenreiter S-EK050, б/у**	**6 911,61**	345,58
17	**Стан клиновой прокатки SP-2500, б/у**	**92 392,98**	4 619,65
18	**Осушитель LW-60AC, б/у**	**1 072,00**	53,60

Демонтаж, разборка, погрузка и транспортировка предмета аукциона проводится за счет покупателя

*Примечание: цена продажи Предмета аукциона фиксируется в протоколе о результатах аукциона в сумме в белорусских рублях, эквивалентной цене продажи лота в долларах США по курсу НБРБ на дату проведения аукциона

Порядок ознакомления: в рабочие дни по предварительному согласованию +375 (29) 6139869 Дмитрий

Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов: аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидир. юридич. лица с публич. торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидир. юридич. лица».
С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте **ipmtorgi.by**

Задаток 1 %, от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

Срок подписания договора купли-продажи – 7 (семь) дней после проведения аукциона

Срок оплаты предмета аукциона: не позднее **7 (семи) календарных дней** со дня проведения аукциона

Победитель аукциона, либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить вознаграждение организатору аукциона в размерах, указанных в информации об аукционе на сайте www.ipmtorgi.by, от цены продажи лота в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона

Предыдущее извещение по лотам №№ 1–12 опубликовано в газете «Звязда» от 25.07.2023 г.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Дата и время начала аукциона	
по лотам №№ 1-12:	**09.10.2023 в 13.00,** г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, оф. 5
по лотам №№ 13-18:	**23.10.2023 в 13.00,** г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, оф. 5
Прием заявок:	
по лотам №№ 1-12:	**06.10.2023 до 17.00,** г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, оф. 5
по лотам №№ 13-18:	**20.10.2023 до 17.00,** г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, оф. 5

Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06.
E-mail: auction@ipmconsult.by

ООО «Юридическая компания Аспект»
проводит первые повторные торги в форме открытого аукциона по продаже имущества ликвидируемого юридического лица – ООО «ЭнергоХорс»

Перечень лотов, размер начальных цен, шага торгов, задатка для участия в торгах, а также условия проведения торгов размещены на сайте ООО «Юридическая компания Аспект» – «aspekt-avs.by» в разделах «Актуальные аукционы. Лоты на реализации. Транспортные средства. Прочее оборудование» по ссылке «https://aspekt-avs.by/aykciony_info/»

*Торги назначены на **03.10.2023 г. в 10.30** по адресу: **г. Минск, ул. Тимирязева, д. 65, оф. 401, холл (4-й этаж)**. Срок приема заявок, внесения задатка для участия в торгах – до **29.09.2023 г.** включительно. Заявки принимаются организатором торгов по месту проведения торгов в рабочие дни с 9.00 до 17.30 (по пятницам – до 16.30)*

Продавец	**ООО «ЭнергоХорс», УНП 192193863**
Организатор торгов	**ООО «Юридическая компания Аспект»**
Реквизиты для оплаты задатка	**ООО «Юридическая компания Аспект», р/с в BYN № BY05TECN30120738300060000000, ОАО «Технобанк», г. Минск, БИК TECNBY22, УНП 191366886**

Получить дополнительную информацию о порядке проведения торгов можно по телефонам: +375 (44) 5986627, 8 (017) 3480699 в рабочие дни с 9.00 до 17.30 (по пятницам – до 16.30). Ознакомиться с предметом торгов возможно по месту нахождения имущества, после предварительного согласования по тел. +375 (44) 5986627. *Объявление о предыдущих торгах опубликовано в газете «Звязда» за 20.05.2023 г. (стр. 10)*

СЕЗОН ГРЫПУ ЧАКАЕЦЦА Ў СТУДЗЕНІ — САКАВІКУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Сёлета перад пачаткам сезону ўздыму рэспіраторных захворванняў у нашай краіне таксама плануецца правядзенне кампаніі вакцынацыі супраць грыпу. Трыдыцыйна яна будзе праходзіць з пачатку кастрычніка да канца лістапада. Плануецца прышчапіць каля 40 % насельніцтва і не менш за 75 % асоб з груп высокай рызыкі.

Да груп высокай рызыкі развіцця цяжкай формы грыпу і неспрыяльных наступстваў адносяцца дзеці ва ўзросце ад 6 месяцаў да трох гадоў, асобы з хранічнымі хваробамі незалежна ад узросту і імунасупрэсіяй, пажылыя людзі ад 65 гадоў і старэйшыя, цяжарныя жанчыны. Да асоб з высокай рызыкай заражэння ў першую чаргу адносяцца медыцынскія работнікі, а таксама работнікі, чыя дзейнасць звязаная з кантактаваннем з людзьмі, і асобы, якія забяспечваюць бяспеку дзяржавы і жыццядзейнасць насельніцтва. Акрамя таго, вакцынацыя супраць грыпу і каранавіруснай інфекцыі важная для работнікаў сферы адукацыі, гандлю, грамадскага харчавання, камунальнай сферы.

Ці актуальны яшчэ COVID-19?

Паводле даных з адкрытых крыніц, на сёння ў свеце больш за 21 мільён чалавек знаходзіцца на лячэнні ад COVID-19, што сведчыць пра тое, што небяспека дадзенай інфекцыі не сышла. Кірыл Ігнатаў падкрэсліў, што сёлета вакцынацыя супраць грыпу будзе праводзіцца на фоне кампаніі вакцынацыі супраць COVID-19. Дапускаецца сумеснае ўвядзенне ў адзін дзень вакцыны супраць грыпу і COVID-19, акрамя жывых вакцын. Таксама гэтыя прышчэпкі могуць праводзіцца ў адзін дзень разам з іншымі прышчэпкамі з нацыянальнага календара ці пераліку прафілактычных прышчэпак па эпідэміялагічных паказаннях.

— Калі правядзенне прышчэпак супраць грыпу і COVID-19 у адзін дзень немагчымае, то варта зрабіць мінімальны інтэрвал у два тыдні паміж увядзеннем дзвюх вакцын, — дадаў эпідэміёлаг. — Ва ўмовах адначасовай цыркуляцыі грыпу і COVID-19 існуе верагоднасць адначасовага заражэння, што можа ўскладніць цяжар працякання хваробы.

Чым будуць прышчапляць?

Па рэкамендацыях Сусветнай арганізацыі аховы здароўя для Паўночнага паўшар'я на гэты эпідсезон рэкамендаваныя вакцыны супраць трох штамаў віруса: H1N1, падобнага на штам «Вікторыя»; H3N2, падобнага на штам «Дарвін»; віруса грыпу В, падобнага на штам «Аўстрыя». Для чатырохвалентных вакцын уключаны штам віруса В «Пхукет».

У нашай краіне ў гэты эпідсезон вакцынацыя супраць грыпу будзе праводзіцца расійскай трохвалентнай вакцынай «Флю-М», французскай «Ваксігрып-Тэтра», швейцарскай «Інфлювак-Тэтра».

Актуальнымі застаюцца і вядомыя меры прафілактыкі — захаванне сацыяльнага дыстанцыявання, мінімізацыя наведвання месцаў масавага збору людзей, рэспіраторны этыкет, гігіена рук.

У выпадку ўзнікнення рэспіраторных інфекцый, асабліва калі гэта датычыцца дзяцей, не трэба займацца самалячэннем, лепш звяртацца ў медыцынскія ўстановы, нагадаў медык. Санітарныя службы праводзяць дазорнае і руцінае назіранне за рэспіраторнымі інфекцыямі ў 18 кантрольных гарадах, падчас якога аналізуецца колькасць асоб, якія звярнуліся ў медыцынскія ўстановы для атрымання дапамогі. Пакуль пад'ём захваральнасці на рэспіраторныя інфекцыі нязначны і звязаны з тым, што вялікая колькасць дзяцей і падлеткаў пайшла ў навучальныя ўстановы, а таксама паколькі змяняецца надвор'е і колькасць сонечных дзён.

Якія сімптомы ВРІ?

Для ўсіх рэспіраторных інфекцый у першую чаргу характэрны пад'ём тэмпературы, наяўнасць насмарку, кашлю, болю ў горле. Пры грыпе назіраецца яшчэ і ламота ў целе, суставах, мышцах. Для ўсіх рэспіраторных хвароб актуальныя агульная млявасць і хуткая стамляльнасць. Пры з'яўленні гэтых сімптомаў варта звяртацца па медыцынскую дапамогу.

Усе рэспіраторныя інфекцыі перадаюцца паветрана-кропельным шляхам — пры чханні, кашлі, дыханні хворы распаўсюджвае рэспіраторныя патагены. Што датычыць грыпу і COVID-19, людзям з аслабленым імунітэтам дастаткова пабыць з захворэлым некалькіх хвілін на адлегласці менш ад метра, каб заразіцца. Для іх надзейнай аховай стане вакцынацыя. Яна не засцерагае ад заражэння, але гарантуе, што працяканне хваробы не будзе цяжкім і не выкліча неспрыяльных наступстваў.

Пры захворванні не рэкамендуецца збіваць гарачка-паніжальнымі тэмпературу да 38 градусаў. Асабістая гігіена — адна з абавязковых умоў пры лячэнні. Як і правільнае збалансаванае харчаванне, якое дапамагае ўмацоўваць імунітэт.

Алена КРАВЕЦ.

Суайчыннікі

НЕ СТРАЦІЦЬ БЕЛАРУСКАСЦІ Ў САБЕ

З 19 да 24 верасня праходзіць IV Фестываль мастацтваў беларусаў свету

Арганізатарамі культурнага форуму выступаюць Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур пры садзейнічанні Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў, аблвыканкамаў, Мінгарвыканкама і іншых арганізацый. Абмен вопытам, дэманстрацыя таго, як нясуць родную культуру за межамі нашай краіны, і шмат разнастайных мерапрыемстваў чакае гасцей і наведвальнікаў у найбліжэйшыя некалькі дзён.

— Фестываль мастацтваў беларусаў свету праводзіцца раз на тры гады. На жаль, пандэмія ўнесла свае карэктывы, таму перапынак быў даўжэйшы. Мэтай дадзенага культурнага форуму з'яўляецца прэзентацыя дасягненняў нашай краіны і падтрымка творчых праектаў беларусаў за мяжой, — адзначыў **намеснік начальніка ўпраўлення культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Дзмітрый СЛЯСАРЧЫК.** — Праграма фестывалю сёлета будзе вельмі насычанай. У ёй прадугледжана правядзенне майстар-класаў для нашых замежных гасцей, якія прыехалі да нас (іх будзе каля 250 чалавек), адбудзецца таксама наведванне рэгіёнаў з канцэртамі нашых суайчыннікаў, каб не толькі ў сталіцы ўбачылі тое мастацтва, з якім прыехалі да нас беларусы з-за мяжы.

У сваю чаргу, **дырэктар Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур Вольга ЯКАБСОН,** распавядаючы аб праграме для ўдзельнікаў форуму, адзначыла, што мерапрыемствы арганізатары выбіралі, арыентуючыся на ўзрост і пажаданні гасцей:

— Праграмныя мерапрыемствы ў нас распачынаюцца 20 верасня. Чакаем гасцей з Самары, Тальяці і шэрагу іншых гарадоў. Спадзяёмся, што ўдзельнікам фестывалю наша праграма спадабаецца. Але самае галоўнае, што беларусы замежжа прыязджаюць да нас з цудоўным настроем, яны імкнуцца на сустрэчу са сваёй Бацькаўшчынай. І таму ўсё, што мы ім прапаноўваем (сустрэчы, майстар-класы, канцэрты), прымаюць з радасцю, каб насыціцца беларускасцю, а потым, з'ехаўшы ў месцы свайго пражывання, забраць з сабой кавалачак нашай Беларусі да наступнай сустрэчы.

Сёлета плануецца ўдзел у фестывалі прадстаўнікоў беларускіх дыяспар з Расійскай Федэрацыі, Італіі, Казахстана, Эстоніі, ЗША, Арменіі і іншых краін. Вечарам 21 верасня адбудзецца адкрыццё фестывалю і гала-канцэрт у Мінскім гарадскім Палацы культуры. Па словах арганізатараў, асноўная ідэя канцэрта — рушнікі «Шляхі дадому». Удзел у святочнай праграме возьмуць не толькі госці, але і беларускія артысты.

— Мы сёння распавядаем, як Беларусь сустракае сваіх сыноў і дачок, якія пражываюць за межамі краіны, але адчуваюць і не губляюць сувязі з ёю. Гэтыя людзі, я сказаў бы, народныя дыпламаты, бо праз іх мы можам даносіць да краін, дзе яны пражываюць, аб'ектыўную інфармацыю пра тое, як і чым жыве наша Беларусь, — сказаў **Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Аляксандр РУМАК.** — Безумоўна, нам вельмі важна падтрымліваць сваіх людзей, якія з розных прычын апынуліся за межамі нашай краіны. Гэтаму напрамку аддаецца шмат увагі. Прычым не толькі ў рамках такіх мерапрыемстваў, як фестываль, бо ўзаемадзеянне пастаяннае. Мы аказваем падтрымку нашым дыяспарам. Для іх набываюцца нацыянальныя касцюмы па заяўках суполак, перадаецца літаратура на беларускай мове, наша нацыянальная сімволіка. Так, за 2022 і 2023 гады ўжо аказана такая падтрымка на больш за 90 тысяч рублёў. Атрымалі падтрымку як прадстаўнікі нашых дыяспар у Расійскай Федэрацыі, так і ў Латвіі, Літве, Эстоніі, Іарданіі, Сірыі, Арменіі і іншых краінах. А ў гэтыя дні нам прыемна сустракаць нашых сяброў на іх радзіме.

Алена ДРАПКО.

Па сутнасці

Шлях на гільяціну

Для Польшчы надышоў час аплаты амерыканскіх крэдытаў. Час расплаты. Плаціць па рахунках вымушаныя звычайныя палякі. Нават за месяц да выбараў улады людзей не чуюць. Ігнаруюць грамадскае меркаванне. Бо цяперашнія кіраўнікі разумеюць: іх выбірае не насельніцтва Польшчы, іх выбірае істэблішмент з уладных кабінетаў англасаксонскага свету. Людзі гэта адчуваюць. Замест звычайнага праменаду польскіх сем'яў да касцёла на вуліцах Варшавы — маршы разлаваных палякаў. Польскія ўлады штурхаюць народ на гільяціну гісторыі. Там утульна або мясцовым нацыяналістам, або збеглым здраднікам. Пішчыць польскі народ пад прыгнётам партыі ПіС.

Напышлівыя амбіцыі польскіх эліт ужо неаднаразова заводзілі іх у тупік. Суседзі ўрокі гісторыі не вывучылі. Дакладней, палітычныя эліты. З такімі ўладамі стаўкі па крэдытах ад амерыканскага патрона толькі растуць. Жорстка, але праўда. Як і раней, палякаў спрабуюць згуртаваць вакол нянавісці да рускіх. Філасофію калектыўнага Гітлера ўзялі для электаральнай стратэгіі дуды і маравецкія. Жадаючы зноў і зноў распасцерці крылы «ад можа да можа», варшаўскі арол неаднойчы трапляў пад раздачу ад сваіх жа старэйшых таварышаў. Палякі, памятайце: гэта ваш герой Пілсудскі быў сябрам Гітлера. Фюрар нават аплакваў яго смерць. А потым пачаў знішчаць палякаў сотнямі тысяч. Палякі, памятайце: гэта вашы галоўныя саюзнічкі Францыя і Брытанія ўжо на дзясяты дзень вайны пагадзіліся з паражэннем Польшчы.

Амбіцыі ўладаў выходзілі безабаронным палякам праз коміны Майданека. І калі б не подзвіг савецкага салдата, то бязмежжа нацысцкіх эксперыментаў сцерла б Польшчу з твару зямлі. Гэта быў Грунвальд 2.0: нашыя ваяры зноў выратавалі палякаў ад анямечвання. Уздоўж польскіх рэк і на польскіх плацдармах мы паклалі сваіх сыноў. Як мінімум паўмільёна салдат. Затое ўжо ў 2017 годзе польскія ўлады таксама «аддзякавалі». У Польшчы набылі моц папраўкі ў закон аб забароне прапаганды камунізму ці іншага таталітарнага ладу. Дакумент абавязвае мясцовыя ўлады зносіць помнікі савецкім воінам. На падліках Інстытута нацыянальнай памяці Польшчы, 230 помнікаў салдатам Чырвонай Арміі трэба адправіць пад бульдозер. Што вельмі эфектыўна сцірае з памяці ўдзячнасць. Цяпер ужо ўнукі выратаваных нашымі салдатамі палякаў трымаюць рулі аўтаматаў у напрамку ўсходу.

Раней Польшчу называлі 51-м штатам ЗША. Мы ж памятаем, як яе называў Ленін. Вашынгтон сапраўды купіў Варшаву. Выгадны геапалітычны набытак. Балячка для Старой Еўропы. І халодная помста для Германіі. Польшча на шляху транзіту даступных вуглевадародаў з Сургута да паспяховых прамыслоўцаў Мюнхена. Хвост вісляе сабакам. Хвост вісляе ў патрэбным напрамку гаспадароў з Белага дома. Фігура для гамбіту на вялікай шахматнай дошцы. Прычым адразу па двух напрамках. У заходнім зразумела. Нас гэта датычыцца пасрэдна. Але Польшча ператварылася ў таран і на ўсход. Англасаксы зайшлі з казырнай карты. Нацыяналізму. Зноў ажылі амбіцыі «ожала бялага». Новы праект Рэчы Паспалітай. Пераразгрузка.

Зрэшты, пад сукно праект балта-чарнаморскай уніі ніхто не хаваў. Проста ў 1990-я ў жаданы новы палітычны ландшафт не ўпісалася Беларусь. А сваю даўнюю нерэалізаваную мару рэваншу — мяжы да Мінска — польскае кіраўніцтва не хавала. Інжэндзмітрыі дабіраліся аж да крамлёўскіх сцен. Не здзіўлюся, калі і тады ў рыштунку захопніцкай экспедыцыі ўдзельнічалі заходнія бенефіцыяры. Не здзіўлюся, калі два паўстанні XIX стагоддзя данацілі немцы і брытанцы. А сёння зразумела як белы дзень: у Варшаве праамерыканская ўлада. І наўрад ці Польшча — 51-ы штат ЗША. Са сваімі так не робяць. Палякі вымушаныя быць філантропамі. Падаткі звычайных фермераў (якіх часам штурмуюць украінскія ракеты) і бізнесменаў ідуць на патрэбы краіны-правапераемніцы подзвігаў тых, хто зладзіў Валынскую разню супраць безабаронных польскіх жанчын, дзяцей і старых. Тады загінула дзевяць тысяч палякаў. А іх нашчадкі плацяць спадкаемцам душагубаў. Так, амерыканская дэмакратыя дорага каштуе.

Польшчу ператварылі ў таран, з дапамогай якога хочуць выламаць уваходныя дзверы ў Брэсцкую крэпасць. Звычайныя палякі гэтага не жадаюць. А ў звычайных палякаў ніхто і не пытаецца. І пакуль польскія ўлады лаюцца, ім рыхтуюць новы Майданек — у топку барацьбы дзеля інтарэсаў сусветнага гегемона. Украіна і Польшча — «санітарны кардон» супраць Расіі. Толькі Украіна ўжо ў выкарыстанні, а Польшча яшчэ не. Рэзерв. Рыхтуюць даўно. Самая мілітарызаваная краіна Еўропы. Вучыце гісторыю, суседзі. Згадайце, у што ператвараецца крэсла варшаўскіх кіраўнікоў, калі польскія легіянеры свае крывыя шаблі накіроўваюць на ўсход...

Яўген ПУСТАВОЙ.

Эксклюзіў

Юрый ШАЎЦОЎ:

«У БЕЛАРУСКА-КІТАЙСКАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА КАЛАСАЛЬНЫЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ»

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

У рамках рэдакцыйнага праекта «Пояс і шлях. 2013—2023» мы працягваем абмеркаванне рэалізацыі найбуйнейшай транснацыянальнай ініцыятывы сучаснасці, якая была вылучана Старшынёй КНР Сі Цзіньпінам дзесяць гадоў таму. Аб тым, якія склаліся перадумовы для яе ўзнікнення, чаму Беларусь стала адным з ключавых удзельнікаў «Аднаго пояса, аднаго шляху», якія перспектывы далейшага развіцця беларуска-кітайскага супрацоўніцтва, у эксклюзіўным інтэрв'ю «Звяздзе» распавёў вядомы беларускі палітолаг, усходазнавец Юрый ШАЎЦОЎ.

— Юрый Вячаслававіч, якія склаліся перадумовы для ўзнікнення «Аднаго пояса, аднаго шляху»?

— Гэты праект шмат у чым насамрэч унікальны. Упершыню Кітаем з пачатку актыўнага пашырэння рэформаў была вылучана глабальная ідэя суразвіцця. Прычым не на ўзроўні двухбаковым, а праз увасабленне транснацыянальнай ініцыятывы, якая б была цікавая многім дзяржавам. Кітай пачаў выбудоўваць вялікае міжнароднае супрацоўніцтва, якое датычыцца перш за ўсё эканомікі. Але не толькі, гэта ўзаемадзеянне ў многіх галінах.

Кітай імкліва развіваецца. І дзесяць гадоў таму ён выйшаў на такі ўзровень развіцця, калі стала цалкам рэальнай задача пераўтварыцца з другой эканомікі ў першую. Яна мае на ўвазе глыбокія канкурэнтныя процівагі з ЗША, а таксама з іх саюзнікамі. Дагэтуль, пачынаючы з 1970-х, калі разгарнуліся маштабныя эканамічныя рэформы ў Кітаі, у краіну прыйшла вытворчасць, нават, хутчэй, зборка розных індустрыяльных прадуктаў развітых краін. Таму амерыканскі Дэтройт згас, а таксама мноства прадстаўнікоў вытворчага сектара. Гэта дало магчымасць для развітых краін перайсці да этапу развіцця, які яны называюць постіндустрыяльнасцю — развіцця на сваёй тэрыторыі ў асноўным сферы паслуг, а таксам навукі і навукова-тэхналагічных галін.

Пачынаючы з 2009 года Кітай дасягнуў узроўню другой эканомікі планеты і гэта прымусіла яго задумацца наконт далейшай стратэгіі развіцця. І яны зрабілі стаўку на пераход ад папярэдняй мадэлі, калі развіваліся перш за ўсё прыбярэжныя эканамічныя зоны, да развіцця ўсёй тэрыторыі. Пачаліся хуткія інвестыцыі ў энергетычную і транспартную інфраструктуру. Такім чынам, Кітай вырашыў зрабіць асноўным драйверам свайго эканамічнага развіцця ўсю нацыянальную тэрыторыю. А гэта можаце сабе ўявіць які па памерах праект. Тады яны адышлі ад ранейшай мадэлі, калі былі майстэрняй Захаду, і пачалі развівацца самастойна.

Сі Цзіньпін пад новую эканамічную мадэль развіцця мадэрнізаваў палітычную сістэму дзяржавы. У Кітаі стаў больш глыбокі гарызонт планавання. Таму ўзнікла патрэба ў тым, каб была больш высокая ступень канцэнтрацыі палітычнай улады. У новай мадэлі быў яшчэ адзін пункт — імклівае нарошчванне спажывання ўнутры краіны. За кошт гэтага яны ўзмацнілі ўнутраны попыт і такім чынам паставілі на парадак дня не толькі развіць цэнтральныя ці заходнія правінцыі, а і яшчэ перайсці да больш высокага тэхналагічнага ўзроўню.

Для адносін паміж ЗША і КНР пераход Кітая да новай сістэмы абазначаў таксама глыбокія ўзрушэнні. Разышліся два галоўныя планетарныя гульцы. І гэта было сістэмным працэсам. ЗША перайшлі ў адказ на дзеянні Кітая да так званай новай індустрыялізацыі. Гэта абазначала перанос з КНР вытворчасцяў на тэрыторыю ЗША. Злучаныя Штаты раскансервавалі свае радовішчы нафты і рушылі ў дадзеным кірунку. Аднак Кітай ужо набраў моц і стаў важкім сусветным цэнтрам прыцягнення. Пры гэтым краіна не фарміруе блок, а развівае гібкую прадукцыйную сістэму стратэгічнага ўзаемадзеяння з краінамі і цэлымі рэгіёнамі. Таму «Адзін пояс, адзін шлях» стаў такім паспяховым, яго з'яўленне — патрэба часу.

— Беларусь стала адной з першых краін, якія далучыліся да ініцыятывы. Чаму так адбылося?

— Кітай заўжды спрыяў развіццю глабальных інфраструктурных праектаў, якія паляпшалі каналы камунікацыі паміж краінамі. Гэта ўзаемавыгаднае справа, якая дазваляе пашыраць гандлёвыя стасункі. Адсюль узнік Новы Шаўковы шлях. У канцы 2000-х Кітай пачаў хутка нарошчваць імпарт з Расіі і Сярэдняй Азіі рознага кшталту сыравіны. КНР была зацікаўленая ў лепшай камунікацыі ў Еўразіі. Дагэтуль у Стары Свет тавары дастаўляліся толькі па моры — судна ішло ад двух тыдняў да двух месяцаў. І ўзнікла патрэба ў паскаўках у Еўропу больш хуткіх тавараў, якія адрозніваюцца па тыпе. Ёсць таварныя групы, што патрабуюць аператыўнай дастаўкі. Яны звязаныя з модай — напрыклад, смартфоны, пэўная бытавая тэхніка. Для такіх паставак аказваецца рэнтабельным выкарыстанне прамога наземнага злучэння. Адпаведна, КНР перайшла да будаўніцтва транспартных калідораў Кітай—Еўропа.

Раней казалі пра Новы Шаўковы шлях, але не праспоўваліся адпаведныя праекты. Пасля 2009 года гэта стала важнай тэмай. Мы трапілі на два з трох адпаведных транспартных калідораў. Адзін ідзе з Далёкага Усходу па Транссібу на Маскву. Другі — з Сінцзяна на Казахстан і на Маскву. Далей на Беларусь і на Санкт-Пецярбург. А ўлічваючы тое, што трэці калідор ідзе побач з Афганістанам — там нявызначанасць і доўгая вайна — і практычна не дзейнічае, Беларусь і Санкт-Пецярбург (дзе ў асноўным кабатажныя перавозкі) сталі асноўнымі пунктамі выхаду кітайскіх тавараў на еўрапейскі рынак і наадварот. Да 2014 года абвастрылася сітуацыя ва Украіне, якая фактычна абрэзала кітайскі транзіт. Мы ператварыліся ў адзіны калідор для дзвюх стратэгічных ветак. Гэта ўнікальны гістарычны шанц, які быў паспяхова выкарыстаны. Яшчэ адной нашай канкурэнтнай перавагай сталі брацкія ўзаемаадносіны з Расіяй.

Праз нашу краіну накіравалася 85 працэнтаў грузаабароту. Рост грузаперавозак праз Беларусь адбываўся каласальнымі тэмпамі — да 40 працэнтаў штогод. Рэальныя перспектывы будаўніцтва высакахуткаснай чыгункі Кітай—ЕС. Хуткасць цягнікоў тады дасягне 600-800 кіламетраў у гадзіну. Шлях з Кітая зойме 1-2 дні.

— Якую ролю тут адыграла палітычная воля?

— Палітычная воля — адзін з галоўных фактараў, якія забяспечылі поспех. Калі б мы былі іншымі, як Літва ці Украіна, то і вынік быў бы адпаведны. Клайпеда мела ўсе шанцы для рэактыўнага развіцця, а паглядзіце, што адбылося. Будаўніцтва «Аднаго пояса, аднаго шляху» паставіла пытанне наконт нашага геапалітычнага выбару, кім мы жадаем быць датычна Кітая. Быць проста транзітнай тэрыторыяй, або зрабіць гэта фактарам нашага інтэнсіўнага развіцця. У свеце шмат месцаў, дзе не выкарыстоўваецца выгаднае геаграфічнае становішча ў поўнай меры. Акрамя таго, своечасова было пастаўлена пытанне наконт стварэння «Вялікага каменя» з тым, каб мы не толькі бралі плату за транзіт, а і зрабілі пункт развіцця. І мы замахнуліся на самы грандыёзны праект такога кшталту за межамі Кітая. Яны пайшлі на яго. Гэта безумоўна цудоўны праект, ён паспяхова развіваецца. Нездарма «Вялікі камень» нярэдка называюць «свабоднай эканамічнай зонай Кітая, якая вынесена ва Усходнюю Еўропу».

Важны момант — беларуская дзяржаўнасць на належным узроўні. Мы даказалі здольнасць захоўваць кіруемасць краінай у 2020-м. Беларусь уваходзіць у тройку краін, з якімі Кітай дасягнуў найвышэйшага ўзроўню двухбаковага супрацоўніцтва. Яшчэ Расія і Пакістан, які рэалізоўвае праект так званага эканамічнага калідора з агульным аб'ёмам інвестыцый каля 50 мільярдаў долараў.

Мы здолелі кампенсаваць цяперашнія геапалітычныя рызыкі праз пастаўкі ў Кітай прадукцыі з Беларусі. Напрыклад, беларускія вытворцы першыя з постсавецкай прасторы пачалі пастаўляць ялавічыну ў КНР. Абсалютна правільна былі вызначаны пункты спецыялізацыі і вызначана стратэгія работы на кітайскім рынку.

— Якія перспектывы далейшага развіцця беларуска-кітайскага супрацоўніцтва?

— Ёсць усе перадумовы да таго, што беларуска-кітайскае супрацоўніцтва будзе пашырацца і надалей, у нас проста каласальныя перспектывы. Тут планы ўвогуле грандыёзныя. У нас пабудавана біятэхналагічная карпарацыя, што выводзіць Беларусь у сусветную пяцёрку краін-вытворцаў адпаведнай прадукцыі, якую мала хто здольны вырабляць.

Акрамя таго запланаваны другі індустрыяльны парк у Барані Аршанскага раёна. Там іншая спецыялізацыя. Калі ў «Вялікім камені» развіваюцца высокатэхналагічная вытворчасць плюс транзіт, прычым разнастайны, то на Аршаншчыне мяркуецца развіццё перш за ўсё сельскагаспадарчага кластара. Падключаюцца вядучыя кітайскія карпарацыі, якія займаюцца вытворчасцю прадуктаў харчавання. Плюс авіятранзіт — аэрадром быў сертыфікаваны на ўсе віды авіяперавозак.

Варта дакладна разумець, што «Адзін пояс, адзін шлях» — сістэмная з'ява, а не кан'юнктурная. Гэты ўнікальны праект цяпер аб'ектыўна ўзмацняецца. У тым ліку — праз узаемадзеянне на міжнародных пляцоўках новага тыпу: ШАС, БРІКС. Да работы ў якіх, дарэчы, Беларусь актыўна падключылася. Наша краіна фактычна стала членам Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва, падала заяўку на ўступленне ў БРІКС.

Уплыў і роля Кітая будуць павялічвацца і надалей. Створаны ўсе перадумовы да таго, што Беларусь будзе пашыраць сваю прысутнасць на рынку сёння другой эканамічнай сілы планеты, а з 2025-га, як чакаецца, першай. Адпаведна будзе паглыбляцца двухбаковае супрацоўніцтва.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

Акцэнты

«Ва ўмовах глабальнай турбулентнасці Кітай дэманструе ўзорнае лідарства,» —

заявіў міністр замежных спраў Беларусі

Кіраўнік знешнепалітычнага ведамства Сяргей АЛЕЙНІК узяў удзел у сустрэчы высокага ўзроўню па выніках супрацоўніцтва ў рамках Ініцыятывы глабальнага развіцця на палях 78-й сесіі Генеральнай Асамблеі ААН у Нью-Ёрку, паведаміла БелТА.

Фота МЗС Беларусі.

«Ва ўмовах цяперашняй глабальнай турбулентнасці, якая пагражае адсунуць на другі план Парадак дня — 2030, Кітай дэманструе ўзорнае глабальнае лідарства, аказваючы падтрымку краінам, якія жывуць у нястачы, каб дапамагчы ім рэалізаваць павестку ў поўным аб'ёме і ў тэрмін. Гэта вялікае бачанне вялікай дзяржавы. Менавіта так мы ў Беларусі ацэньваем Глабальную ініцыятыву развіцця Кітая, вылучаную старшынёй КНР Сі Цзіньпінам два гады таму. Не будзе перабольшаннем сказаць, што Кітай неаднойчы здзіўляў свет сваімі поспехамі», — падкрэсліў Сяргей Алейнік.

Па словах міністра, свет змог дасягнуць Мэт развіцця тысячагоддзя да 2015 года шмат у чым дзякуючы поспеху Кітая ў вызваленні 800 мільёнаў чалавек ад беднасці за апошнія дзесяцігоддзе. Аналагічным чынам менавіта дзякуючы кампаніі, распачатай кіраўніцтвам Кітая ў 2013 годзе, краіна цалкам ліквідавала абсалютную беднасць усяго за восем гадоў — да 2021-га.

«У нас няма ніякіх сумненняў у тым, што ініцыятывы Кітая, такія як «Пояс і шлях» і Ініцыятыва глабальнага развіцця, будуць такімі ж паспяховымі, як і яго кампаніі ўнутранага развіцця. Беларусь вітала запуск Глабальнай ініцыятывы развіцця ў 2021 годзе і імкнецца скарыстацца прапанаванымі ў рамках ініцыятывы перавагамі», — звярнуў увагу кіраўнік знешнепалітычнага ведамства.

Беларусь адразу ж далучылася да Групы сяброў ініцыятывы і ўважліва сочыць за яе развіццём. Раней сёлета наша краіна таксама далучылася да сеткі Цэнтра садзейнічання глабальнаму развіццю, найважнейшага кампанента ініцыятывы, які служыць платформай для яе рэалізацыі.

«Упэўнены, што Ініцыятыва глабальнага развіцця будзе садзейнічаць далейшаму дасягненню Мэт устойлівага развіцця (МУР), станаўленню шматпалярнага свету і дапаможа ліквідаваць выкарыстанне незаконных аднабаковых прымусовых мер, якія сур'ёзна перашкаджаюць выкараненню беднасці, забеспячэнню харчовай бяспекі і закранаюць многія іншыя кірункі ў рамках МУР», — заявіў дыпламат.

Ініцыятыва глабальнага развіцця (Global Development Initiative) была абвешчана лідарам КНР Сі Цзіньпінам у верасні 2021 года падчас выступлення на сесіі Генеральнай Асамблеі ААН. Яна з'яўляецца адной з ключавых знешнепалітычных ініцыятыў Кітая. Асноўнай задачай з'яўляецца ажыццяўленне практычнага ўзаемадзеяння ў васьмі абласцях, уключаючы скарачэнне беднасці, харчовую бяспеку, ахову здароўя, змяненне клімату, фінансаванне развіцця, індустрыялізацыю, лічбавую эканоміку, у мэтах дасягнення ўстойлівага развіцця. Неўзабаве пасля абвяшчэння ініцыятывы КНР пачала ствараць механізмы для яе рэалізацыі.

Так, яшчэ ў 2021 годзе створана Група сяброў ініцыятывы, у якую сёння ўваходзіць каля 60 дзяржаў. Беларусь уступіла ў групу ў ліку першых краін. У верасні мінулага года пад старшынствам міністра замежных спраў Кітая Ван І ў Нью-Ёрку адбылася міністэрская сустрэча Групы сяброў.

У Пекіне створаны Цэнтр садзейнічання глабальнаму развіццю і сетка Цэнтра садзейнічання глабальнаму развіццю. Апошні механізм уключае каардынатараў ад краін — членаў Групы сяброў ініцыятывы. У рамках ініцыятывы пачалася рэалізацыя дзясяткаў праектаў, галоўным чынам у найменш развітых краінах. Фінансаванне праектаў ажыццяўляецца Кітаем праз два фонды ў рамках ААН — Фонд міру і развіцця, а таксама Фонд глабальнага развіцця і супрацоўніцтва Поўдзень — Поўдзень.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
21 ВЕРАСНЯ 2023 г.
ЧАЦВЕР
№ 18 (15962)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

Элеанора КАЧАЛОЎСКАЯ:

«Быць прыгожай — гэта ў першую чаргу быць сапраўднай»

Светлавалосая, блакітнавокая, добрая і шчырая — менавіта такая дзяўчына па-сапраўднаму ўвасабляе прыгажосць нашай краіны. Сёлета за тытул «Міс Беларусь» у фінале XIII Нацыянальнага конкурсу прыгажосці змагаліся дваццаць чатыры дзяўчыны з рэгіёнаў і сталіцы. Пераможцай стала мінчанка Элеанора Качалоўская, якая расказала нам аб падрыхтоўцы да конкурсу, сваім хваляванні ў дзень фіналу і адказнасці, якая прыйшла да яе разам з каронай.

Элеаноры дваццаць тры гады. Яна ўжо скончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, а цяпер навучаецца на псіхолага ў педагагічным універсітэце. Паралельна працуе менеджарам мадэльнага агенцтва ў Нацыянальнай школе прыгажосці. А вось у Мінск пераехала некалькі гадоў таму з Гомеля, дзе і пачалася яе кар'ера ў сферы прыгажосці.

— Упершыню ў свет мадэлінгу я трапіла, калі была яшчэ зусім дзіцем. Мне было гадоў пяць-шэсць, і мы з мамай пайшлі да цырульніка цёткі Олі, якая на той момант працавала з мадэлямі. Тады яна параіла мне прыняць удзел у конкурсе прыгажосці «Маленькая гамяльчанка», але на той момант мне гэта было зусім не цікава. Я ўвогуле ў дзяцінстве хацела стаць прадаўцом рыбы. Мы з мамай часта хадзілі на рынак, і мне вельмі падабалася адна прадаўшчыца сваёй энергіяй. *(Смяецца.)* Праз нейкі час я пачала наведваць мадэльную школу ў Гомелі і ўжо праз два гады ўсё ж прыняла ўдзел у гэтым конкурсе і перамагла. Пасля гэтага мяне запрасілі супрацоўнічаць з фабрыкай «8 Сакавіка» і кампаніяй «Світанак».

Яшчэ праз два гады юная Элеанора выйграла конкурс «Little Miss and Mister World 2012», які праходзіў у Турцыі. Як пісалі тады СМІ, маленькая красуня пакарыла журы не толькі дэфіле, але і вершам Караткевіча пад мелодыю «Белавежскай пушчы». І ў гэты ж час атрымала свой першы кантракт на работу ў Мілане. Але, нягледзячы на значныя поспехі ў свеце мадэлінгу, у шаснаццаць гадоў дзяўчына ўзяла паўзу і ўсю сябе прысвяціла падрыхтоўцы да паступлення ва ўніверсітэт.

— У маім жыцці вельмі часта ўсё адбываецца выпадкова. Я не планавала вяртацца ў гэтую дзейнасць. Аднак, будучы яшчэ студэнткай, стала працаваць у Нацыянальнай школе прыгажосці ў Мінску, дзе пасля пачала праходзіць адпрацоўку пасля заканчэння вучобы. Ужо падчас працы я воляй лёсу пазнаёмілася з фатографам і, дзякуючы «сарафаннаму радыё», атрымала кантракт на работу ў Турцыі мадэллю. Так адбылося і з конкурсам. Усё па волі лёсу. Проста аднойчы, выйшаўшы са спартзалы, наўпрост трапіла на кастынг «Міс Беларусь».

(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)

Крок да прафесіі

ПА ДОБРЫ ДОСВЕД ПРАЦЫ — НА ЧЫГУНКУ

Студэнцкі рух на Беларускай чыгунцы з кожным годам актыўна развіваецца. Калі летась у арганізацыях магістралі працавалі каля 230 студэнтаў і навучэнцаў, то сёлета — у 2,5 раза болей.

У ліпені-верасні яны шчыравалі праваднікамі пасажырскіх вагонаў і манцёрамі пуці, цеслярамі і малярамі, выхавацелямі і інструктарамі ў дзіцячых аздараўленчых лагерах. Пашырылася і геаграфія навучальных установ краіны. Калі ў 2022 годзе гэта былі байцы студатрадаў з дзесяці вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, то сёлета — ужо з больш чым 30, паведамляе прэс-цэнтр магістралі.

У маі мінулага года Беларускай чыгункай і ГА «БРСМ» было падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве, накіраванае на развіццё ўзаемадзеяння па пытаннях фарміравання і прыцягнення студэнцкіх атрадаў для работы ў арганізацыях магістралі.

У бягучым годзе пры падтрымцы Цэнтральнага камітэта БРСМ было арганізавана папярэдняе навучанне 200 студэнтаў і навучэнцаў — удзельнікаў чыгуначных сэрвісных і будаўнічых студэнцкіх атрадаў па прафесіях «Праваднік пасажырскага вагона» і «Манцёр пуці».

Падчас сустрэчы кіраўніцтва Беларускай чыгункі з актывам сэрвісных і будаўнічых студэнцкіх атрадаў яго байцы падзяліліся сваімі ўражаннямі аб рабоце на магістралі, а таксама адзначылі высокі ўзровень арганізацыі іх працоўнай дзейнасці, магчымасць атрымаць добры досвед работы, стасункаў і новыя веды.

Кіраўніцтва магістралі падзякавала прадстаўнікам студэнцкіх атрадаў за работу, а таксама выказала надзею, што пасля заканчэння навучальных устаноў многія з іх захочуць прадоўжыць свой працоўны шлях на прадпрыемствах і ў арганізацыях магістралі.

Прадстаўнікі БРСМ, у сваю чаргу, адзначылі важную ролю студатрадаўскага руху ў рэалізацыі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі ў краіне і вялікі ўклад Беларускай чыгункі ў яго развіццё.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Прафарыенцір

У трэндзе — выбар рабочай прафесіі

Калі футуролагі разважаюць пра будучыню, то кажуць, што, выбіраючы прафесію, трэба быць гатовымі выконваць функцыі, якіх сёння яшчэ няма. Але не ўсе прафесіі знікнуць. Паводле прагнозаў, 70—80 працэнтаў існуючых сёння прафесій застануцца, але трансфармуюцца пад уздзеяннем лічбы. Паводле глабальнага даследавання працоўных рэсурсаў, дэфіцыт рабочай сілы ў свеце ў 2030 годзе будзе складаць прыкладна 85 мільёнаў чалавек, але востры недахоп будзе абумоўлены адсутнасцю навыкаў, а не людзей. Галоўная праблема — не адсутнасць рабочых рук, а адсутнасць кваліфікаваных работнікаў.

Многія вытворчыя прадпрыемствы выкарыстоўваюць абсталяванне сусветнага ўзроўню, сучасную тэхніку і тэхналогіі. Зыходзячы з гэтага, работадавец чакае тэхнічна падрыхтаваных рабочых, якія змогуць працаваць з інавацыйным абсталяваннем і ўмець яго абслугоўваць. Між іншым, рабочыя прафесіі запатрабаваны не толькі на буйных прамысловых прадпрыемствах, але і ў малым і сярэднім бізнесе. І гэта, як правіла, прадпрыемствы будаўніцтва, гандлю, гасцінічнай сферы, грамадскага харчавання, сельскай гаспадаркі і сферы паслуг. Ці разумеюць гэта выпускнікі, якія часта пад уплывам чужога меркавання імкнуцца атрымаць менавіта вышэйшую адукацыю і пайсці ў сферу разумовай працы?

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
21 09 2023 г.

Лакацыі актыўнасці

ПАЧУЦЬ «ГОЛАС ЛІДАРА»

